Слова для Жыцця (86)

Аўтар: Рэдакцыя
22.02.2015 01:00



Папа Францішак

Нягледзячы на шматлікія дасягненні ў галіне навукі, унутраныя і фізічныя пакуты людзей абуджаюць сур'ёзныя пытанні адносна сэнсу хваробы і болю, а таксама сэнсу смерці. Гаворка ідзе пра экзістэнцыяльныя пытанні, на якія душпастарская дзейнасць Касцёла павінна рэагаваць святлом веры, маючы перад вачыма Укрыжаванага, у якім аб'яўлена ўся збаўчая таямніца Бога Айца, які з любові да людзей не пашкадаваў свайго Сына (Рым 8, 32). Таму кожны з нас пакліканы несці святло Евангелля і моц ласкі тым, хто пакутуе, і тым, хто ім дапамагае – членам сям'і, урачам, медсёстрам – каб служэнне хворым было больш чалавечным, са шчодрай адданасцю, з евангельскай любоўю. Мы просім Марыю, Аздараўленне Хворых, каб кожны чалавек мог адчуць у хваробе, дзякуючы апецы тых, хто знаходзіцца побач, моц Божай любові і суцяшэнне Яго бацькоўскай пяш-чоты.

Анёл Панскі са Святым Айцом, 08.02.2015 †

Слова для Жыцця (86)

Аўтар: Рэдакцыя
22.02.2015 01:00

